Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “НАЗОЎНІК.
# СЛОВАЎТВАРЭННЕ НАЗОЎНІКАЎ. ПРАВАПАІС НАЗОЎНІКАЎ”

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01 Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск
2018

## ЗМЕСТ

**I. Тэарэтычны раздзел**

1. Словаўтварэнне назоўнікаў

2. Правапіс назоўнікаў

   2.1. Правапіс суфіксаў назоўнікаў

   2.2. Правапіс складаных назоўнікаў

3. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні форм назоўніка

4. Марфалагічны разбор назоўнікаў

**II. Пытанні да самакантролю ведаў**

**III. Практычнаыя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## I. Тэарэтычны раздзел

### 1. Словаўтварэнне назоўнікаў

Назоўнікі ўтвааюцца ўсімі спосабамі словаўтварэння. Найбольш пашыраныя з іх – суфіксальны спосаб і складанне асноў.

Суфіксальным спосабам утвараюцца назоўнікі ад розных часцін мовы: *вучыцца – вучоба, прыгожы – прыгажосць, два – двойка, свой – сваяк*.

Пры дапамозе суфіксаў утвараюцца назоўнікі, што абазначаюць асобу, канкрэтныя прадметы, прылады працы, рэчывы, абстрактныя паняцці і інш: *будаўнік, гадзіннік, сеялка, смеласць*.

Суфіксы *-нік(-ніц-), -чык(-чыц-), -шчык(-шчыц-), -льнік(-льніц-), -іст(-іст-к-), -ыст (-ыст-к-), -ар(-ар-к-), -ач(-ач-к-)* і інш. выкарыстоўваюцца для ўтварэння назоўнікаў са значэннем асобы паводле роду заняткаў, дзейнасці, прафесіі: *вартаўнік, настаўніца, чытальнік, лётчык, сувязіст, свінарка, слухач*.

Назоўнікі, якія абазначаюць асоб паводле нацыянальнасці, месца нараджэння, жыхарства, ўтвараюцца ад назоўнікаў пры дапамозе суфіксаў *ан-ін(-ян-ін), -ан-к-, -ін(-ын), -ін-к-, -ак(-як), -ац(-ец), -іч, -ук* і інш.: *кітаец, паляшук, масквіч, армянін, капылянін, гараджанка.*

Пры дапамозе суфіксаў *-ік(-іц-), -ец, -ак(-як), -ун* ад прыметнікаў утвараюцца назоўнікі, якія абазначаюць асоб паводле іх індывідуальных якасцей, знешняга выгляду: *разумнік, разумніца, шчаслівец, бядняк, хітрун.*

Абстрактныя назоўнікі найчасцей утвараюцца пры дапамозе суфіксаў -*осць(-асць), -ств-(-цтв-), -нн-, -енн-(-энн-), -к-, -ын-(-ін-), -от-(-ат-), -б-*, і інш.: *разуменне, падрыхтоўка, знаёмства, свежасць, белізна, цемната, геройства.*

Суфіксальным спосабам утвараюцца назоўнікі са значэннем зборнасці, адзінкавасці і назвы маладых істот: *дубняк, хвойнік, студэнцтва, травінка, зубраня.*

Некаторыя суфіксы пры далучэнні да назоўнікаў надаюць ім не новае значэнне, а толькі сэнсавыя адценні памяншальнасці, ласкальнасці, павелічальнасці, узмацняльнасці, зневажальнасці, напрыклад: *дом – дамок,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*рэчка – рэчанька, кот – каток, коцік, каточак, маці – матуля, стог – стажышча, гультай – гультаіна.* Суфіксы, якія надаюць словам сэнсавыя адценні, называюцца ***суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі***.

***Прыставачны*** спосаб у параўнанні з суфіксальным менш прадуктыўны. Гэтым спосабам назоўнікі ўтвараюцца ад назоўнікаў шляхам далучэння да слова прыстаўкі: *шчасце – няшчасце, парадак – беспарадак*.

Прыставачна-суфіксальным спосабам утвараюцца назоўнікі пры дапамозе прыставак і суфіксаў: *узлесак, пагалоўе, падмурак, закутак*.

Некаторыя назоўнікі з абстрактным значэннем утвараюцца ад прыметнікаў і дзеясловаў без словаўтваральных афіксаў. Гэта так званае ***бязафікснае ўтварэнне***: *чырвоны – чырвань, бегчы – бег*.

***Асноваскладанне*** – спосаб утварэння назоўнікаў шляхам складання асноў. Аб'ядноўваюцца асновы ў складаныя словы пры дапамозе суфіксаў і без іх: *краявід, крыгаход, першакласнік, першапраходзец*. Асновы паміж сабой могуць звязвацца пры дапамозе злучальных афіксаў (інтэрфіксаў): *новабудоўля, часопіс, землекарыстанне, земляроб*, радзей без іх: *пяцідзёнка, шматтыражка.*

Утварэнне складаных назоўнікаў шляхам аб'яднання частак скарочаных слоў называецца ***абрэвіяцыяй***. Складанаскарочаныя словы (абрэвіятуры) могуць утварацца з пачатковых гукаў: *БДПУ, АТС*; з часткі першага слова і пачатковых гукаў наступных слоў: *завуч, аблана*; з частак слоў: *мапед, прафкам*, з часткі аднаго слова і поўнага другога слова: *медпункт, санстанцыя*.

У назоўнікі могуць пераходзіць іншыя часціны мовы, пераважна прыметнікі і дзеепрыметнікі. Пераход іншых часцін мовы ў назоўнікі называецца ***субстантывацыяй.*** Пры субстантывацыі прыметнікі і дееприметнікі набываюць прадметнае значэнне і зменную катэгорыю роду: *мінулае, марожанае, знаёмы, добрае, вечнае*.

***Семантычны*** спосаб утварэння назоўнікаў звязаны з пераасэнсаваннем раней вядомых слоў: *брыгадзір, кулак*, або з распадам полісеміі, калі ўтвараюцца два словы з новым значэннем: *шапка* "галаўны ўбор" і "агульны загаловак".

**2. Правапіс назоўнікаў**

**2.1. Правапіс суфіксаў назоўнікаў**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял “Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”- Мінск, 2008 –144 с.]

1. Суфікс ***-ец- (-ац-)*** пішацца ў назоўніках мужчынскага роду. Пры змяненні слова галосны выпадае: *акраец, індыец, разец,ісцец* (родны склон *істца*), *плывец, мсцівец, вясковец, карміле ц, удалец, баец, бельгіец, незнаёмец, канькабежац, аварац, запарожац*.

2. Суфікс ***-іц- (-ыц-)*** пішацца ў назоўніках жаночага роду і беглага галоснага не мае: *ваколіца, патыліца, спадарожніца, мсцівіца, карміліца, розніца, кірыліца, кніжыца*.

3. Памяншальна-ласкальны суфіксальны комплекс ***-ічк- (-ычк-)*** пішацца ў назоўніках жаночага роду, якія ўтварыліся ад слоў з фіналлю-іц- (-ыц-): лесвічка, крынічка, сунічка, завушнічка, запальнічка, палічка (ад паліца), сястрычка.

У астатніх выпадках пішацца памяншальна-ласкальны суфіксальны комплекс **-ечк- (-ачк-):***дзядзечка, бутэлечка, лялечка, цётачка, галовачка, булачка, палачка (ад палка), рэчачка, курачка (ад курка), качачка, божачка, вушачка, Сонечка, Волечка, Ванечка, Жэнечка, Сцёпачка, Наташачка, Ганначка.*

4. Суфікс ***-ак- (-ек-)*** пішацца не пад націскам у назоўніках, якія ва ўскосных склонах губляюць суфіксальнае ***а*** ці ***е***: *сшытак — сшытка, пасынак — пасынка, каласочак — каласочка, дожджычак — дожджычку, прыцемак — прыцемку, аловак — алоўка, перашыек — перашыйка.*

5. Суфіксы ***-ік- (-ык-), -нік-, -чык-*** пішуцца нязменна ва ўсіх формах слоў: *конік — коніка, столік — століка, хлопчык — хлопчыка, дожджык — дожджыку, вожык — вожыка, тэарэтык — тэарэтыка, спадарожнік — спадарожніка, пеўнік — пеўніка, дарадчык — дарадчыка*.

6. Суфікс ***-ень- (-ань-)*** ва ўскосных склонах у адных назоўніках захоўвае галосны, у другіх яго губляе: *вусень — вусеня, прамень — праменя; але: вучань — вучня, шчэбень — шчэбню, валасень — валасня. Часам дапускаюцца абедзве формы: кіпень — кіпеню і кіпню*.

7. Суфіксы ***-чык- (-чыц-) і -шчык- (-шчыц-)*** ужываюцца пры ўтварэнні назоўнікаў, якія называюць людзей паводле заняткаў.

Суфікс ***-чык- (-чыц-)*** пішацца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- калі ўтваральная аснова заканчваецца на пярэднеязычныя **д, т, з, с**: *аб’ездчык, дакладчык, дарадчыца, наладчык, ракетчык, пераплётчыца, лётчык, грузчык, возчык, рэзчык, перапісчык, перапісчыца* (а таксама ў адпаведных прыметніках: *дарадчыцкі, перапісчыцкі* і інш.);
- калі ў канцы ўтваральнай асновы адбываецца чаргаванне [г] — [ж]: *перабягаць — перабежчык, перабежчыца, перабежчыцкі, нябога — нябожчык, абцягваць — абцяжчыца*.

Суфікс ***-шчык- (-шчыц-)*** пішацца:

- калі аснова заканчваецца на санорныя **р, л, м, н, й**: *зваршчык, наборшчыца, вугальшчык, мадэльшчык, прыбіральшчыца, атамшчык, паромшчык, бетоншчыца, згоншчык, мыйшчык, пайшчык, пайшчыца, забойшчык* (а таксама ў адпаведных прыметніках: *наборшчыцкі, пайшчыцкі* інш.);
- пасля спалучэнняў тых жа санорных з наступнымі **т, г** утваральнай асновы: *працэнт — працэнтшчыца, аліменты — аліментшчык, аліментшчыца, кобальт — кобальтшчык, цюбінг — цюбінгшчык*;
- калі ўтваральная аснова заканчваецца на губныя зычныя **б, п, м, ф** і **ў**: *рубшчык, гардэробшчыца, апалубшчык, падкопшчык, скупшчык, скупшчыца, паромшчык, літаграфшчык, бунтаўшчык, нарыхтоўшчык, палясоўшчык, забудоўшчык*.

8. З дапамогай суфіксаў ***-чын-*** і ***-шчын-*** утвараюцца дзве семантычна розныя групы назоўнікаў: назоўнікі са значэннем пэўнай грамадскай з’явы і назоўнікі са значэннем рэгіёна, абшару.

Суфікс ***-чын-*** пішацца пасля ўтваральных асноў, што заканчваюцца на **д — т, з — с, ж — ш, дж — ч**: *складчына (склад-), спадчына (спад-), азіятчына (азіят-), салдатчына (салдат-), братчына (брат-), старасветчына (-свет-), казаччына (казак-/казач-), рэкрутчына(рэкрут-); Валагодчына (валагод-), Брэстчына (брэст-), Навагрудчына (навагруд-), Ноўгарадчына (ноўгарад-), Суражчына (сураж-), Добрушчына (добруш-), Няմеччына (нямец-/нямеч-), Турэччына (турэц-/турэч-), Дабружчына (дабруж-), Глушчына (Глуск: глух-/глуш-), Грэшчына (Грэск: грэс-/грэш-), Полаччына (Полацк: полат-/полац-/полач-), Случчына (Слуцк: слуц-/случ-).*

Суфікс ***-шчын-*** пішацца пасля ўтваральных асноў, што заканчваюцца на губныя **б, п, м, ф, в** або санорныя **н, р, л, й**, а таксама **ў** (з в або л): *скупшчына (скуп-), здзельшчына (здзель-), нелегальшчына (нелегаль-), партызаншчына (партызан-), мінуўшчына (мінул-/мінуў-), суб’ектыўшчына (суб’ектыв-/суб’ектыў-), літаратуршчына (літаратур-), ваеншчына (ваен-),*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*кампанейшчына (кампаней-), тарабаршчына (тарабар-), татаршчына (татар-), канцылярщчына (канцыляр-), папоўшчына (папов-/папоў-), хаваншчына (хаван-), мітынгоўшчына (мітынгов-/мітынгоў-), цыганшчына (цыган-); Браслаўшчына (браслаў-), Гомельшчына (гомель-), Гуцульшчына (гуцуль-), Гродзеншчына (гродзен-), Смаленшчына (смален-), Міншчына (мін-), Бабруйшчына (бабруй-), Зэльвеншчына (зэльвен-), Магілёўшчына (магілёў-), Віцебшчына (віцеб-).*

Суфікс ***-шчын-*** пішацца і тады, калі ўтваральная аснова заканчваецца на зычны з папярэднім санорным: *інтэлігентшчына (інтэлігент-), эмігрантшчына (эмігрант-), Самаркандшчына (самарканд-).*

**2.2. Правапіс складаных назоўнікаў**

1. Пішуцца р а з а м:

- складаныя назоўнікі з дзвюх і больш асноў, якія спалучаюцца пры дапамозе злучальных галосных **о (а), е (я):***конезавод, льнозавод, далягляд, землетрасенне, птушкагадоўля, чалавекалюбства, бульбакапалка, хлебапякарня, свінагадоўля, старадрук, чарназём, гарналыжнік, самалёт, патолагаанатам, медыкапсіхолаг*;

- складаныя назоўнікі, у якіх першай часткай з’яўляецца дзеяслоўная форма загаднага ладу на **-і (-ы**): *вярцішыйка, сарвігалава, вярнідуб, прайдзісвет, пакацігарошак; але: перакаці-поле*;

- складаныя назоўнікі ад’ектыўнага тыпу скланення, калі яны з’яўляюцца навуковымі тэрмінамі: *галаваногія, бруханогія*;

- складаныя ўласныя назвы паселішчаў з пачатковай часткай **нова-(нава-), стара-, верхне- (верхня-), ніжне- (ніжня-), сярэдне- (сярэдня-)** і інш.: *Новалукомль, Наваполацк, Навасады, Навагрудак, Старакожаўка, Верхнядзвінск, Ніжнявартаўск, Сярэдняборск, Краснаполле, Крутагор’е, Светлагорск.*

2. Пішуцца п р а з  з л у ч о к  складаныя назоўнікі:

- у якіх скланяюцца ўсе словы: *папараць-кветка, вагон-рэстаран, лётчык-касманаўт, член-карэспандэнт;*

- у якіх скланяецца толькі апошняе слова: *жар-птушка, сон-трава, стоп-сігнал, вакуум-насос, дызель-матор, генерал-маёр, прэм’ер-міністр, норд-ост*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- з аднаслоўным прыдаткам: *лён-даўгунец, заяц-русак, нявеста-красуня, дзед-мароз, горад-герой.* Пры адваротным парадку назоўніка і аднаслоўнага прыдатка злучок не пішацца: *красуня дзяўчына*;

- са значэннем цэласнай адзінкі вымярэння: *кілават-гадзіна, тона-кіламетр-гадзіна, самалёта-вылет, чалавека-дзень*; але: *працадзень*;

- якія называюць прадстаўнікоў палітычных і іншых грамадскіх рухаў: *ліберал-дэмакрат, нацыянал-патрыёт, сацыял-дэмакрат*;

- з пачатковымі часткамі **арт-, віцэ-, вэб-, лейб-, максі-, міні-, обер-, унтэр-, штаб- (штабс-), экс-, прэс-, блок-**: *арт-галерэя, віцэ-прэм'ер, вэб-старонка, лейб-гвардыя, максі-прэс, міні-матч, обер-майстар, унтэр-афіцэр, штаб-ротмістр, штабс-капітан, экс-чэмпіён, экс-прэм'ер, прэс-сакратар, блок-сігнал; але: блокпост.*

3. Пішуцца праз злучок:

- субстантываваныя спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца назвамі раслін: *брат-і-сястра*;

- састаўныя прозвішчы, імёны і назвы геаграфічных аб'ектаў: *Бялыніцкі-Біруля, Дунін-Марцінкевіч, Жан-Жак Русо, Бурат-Манголія, Эльзас-Латарынгія, Аўстра-Венгрыя, Камянец-Падольскі, Буда-Кашалёва, Пераяслаў-Хмяльніцкі, Давыд-Гарадок, Камень-Кашырскі;*

- уласныя геаграфічныя назвы, якія з'яўляюцца спалучэннем назоўніка з назоўнікам у месным склоне і прыназоўнікам **на**, а таксама падобнымі іншамоўнымі спалучэннямі слоў з **дэ**, **сюр**: *Растоў-на-Доне, Франкфурт-на-Майне, Па-дэ-Кале, Булонь-сюр-Мэр*;

- іншамоўныя ўласныя імёны з канцавымі часткамі **-хан, -шах, -паша, -бей, -бай, -задэ, -аглы, -кызы, -бек** і інш.: *Ахмат-шах, Асман-паша, Ізмаіл-бей, Курман-бай, Турсун-задэ, Кёр-аглы, Зейнал-кызы, Асман-бек*;

іншамоўныя ўласныя назвы асоб і геаграфічных аб'ектаў з пачатковымі часткамі **Ван-, Мак-, Нью-, Сан-, Санкт-, Сен-, Сент-**: *Ван-Дэйк, Мак-Магон, Мак-Кінлі, Нью-Кастл, Сан-Себасцьян, Сан-Марына, Санкт-Пецярбург, Сен-Санс, Сент-Экзюперы;*

уласныя назвы паселішчаў з пачатковай часткай **Усць-, Верх-, Соль-**: *Усць-Каменагорск, Верх-Ірмень, Соль-Ілецк*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Калі ў назве, якая складаецца з двух і больш назоўнікаў, першы абазначае родавае паняцце, а другі з’яўляецца ўласным імем, яны пішуцца асобна: *рака Днепр, горад Мінск, вулкан Везувій, маёр Кравец, дзед Янка*.

5. Артыклі і часціцы (**да, дэ, ла, ле, ля** і інш.), а таксама словы **дэр, дон, фон, ван** у іншамоўных уласных назвах пішуцца асобна: *Леанарда да Вінчы, Шарль дэ Кастэр, Анарэ дэ Бальзак, ла Валета, ла Мот, ле Шапелье, ля Крэзо, Ван дэр Мейлен, фон дэр Гольц, дон Хуан, Людвіг ван Бетховен*.

6. Асобна пішуцца словы ў геаграфічных уласных назвах, якія з’яўляюцца спалучэннем поўнага прыметніка ці парадкавага лічэбніка з назоўнікам: *Стары Свержань, Белы Груд, Карнаты Дуб, Вялікія Радванічы, Старыя Дарогі, Астрашыцкі Гарадок, Восьмая лінія* (вуліца), *Першая пасялковая* (вуліца), *Першы чыгуначны* (завулак) [Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### 3. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні формаў назоўніка

Асноўныя прычыны памылак у выкарыстанні формаў назоўнікаў часцей за ўсё выкліканы:

- несупадзеннем катэгорыі  роду ў рускай і беларускай мовах;
- несупадзеннем катэгорыі  ліку ў рускай і беларускай мовах;
- несупадзеннем ў скланенні ў рускай і беларускай мовах.

Родавыя разыходжанні ахопліваюць невялікі пласт лексікі рускай і беларускай моў. Найбольшую цяжкасць пры вызначэнні роду выклікаюць словы тыпу: *боль, цень, гусь, мазоль* і інш.

Граматычныя формы адзіночнага і множнага ліку рускіх і беларускіх назоўнікаў часцей за ўсё супадаюць. Аднак гэта супадзенне няпоўнае. І ў рускай, і ў беларускай мовах фармальным паказчыкам ліку з’яўляецца канчатак. Форма множнага ліку рускіх назоўнікаў утвараецца пры дапамозе канчаткаў *–и, -ы, -а, -я, -е* (*книги, мечты, окна, поля, славяне*). У беларускай мове назоўнікі множнага ліку маюць канчаткі *–ы, -і, -е* (*студэнты, палі, вокны, гараджане*). Існуюць выпадкі, калі пры аднолькавых канчатках не супадае граматычная форма ліку назоўнікаў: *чернила* (мн. ч.) – *чарніла* (адз. л.), *белила* (мн.ч.) – *бяліла* (адз.л.). Некаторыя назоўнікі ў рускай і беларускай мовах ужываюцца толькі ў пэўным ліку. Так назоўнік *дзверы* ў беларускай мове ўжываецца ў множным ліку, а ў рускай мове – у адзіночным (*дверь*); назоўнік *конопля* ў рускай мове ўжываецца ў адзіночным ліку, а ў беларускай – ў множным ( *каноплі*) назоўнік *грудзі* ў рускай мове можа ўжывацца як у

адзіночным (*грудь*), так і ў множным ліку (*груди*), а ў беларускай мове – толькі ў множным (*грудзі*).

У рускай і беларускай мовах назоўнікі (акрамя нескланяльных) скланяюцца. Катэгорыя скланення цесна звязана з катэгорыямі роду і ліку. Тып скланення вызначаецца родам назоўніка. З прычыны несупадзення роду ў рускай і беларускай мовах можа назірацца блытаніна ва ўжыванні канчаткаў некаторых граматычных формаў назоўнікаў. Так, некаторыя назоўнікі першага скланення ў давальным і месным склонах маюць канчаткі *–е(-э)* як у рускай, так і ў беларускай мове, але ў беларускай мове назіраецца чаргаванне зычных *г//з, к//ц* ( *дороге – дарозе,руке – руцэ*). Пры гэтым пасля *ц* у ненаціскным становішчы ўжываецца канчатак *–ы* (*книжке – кніжцы*), а ў націскным -- -э́: (дочке – дачцэ́, муке – муцэ́). У месным склоне множнага ліку назоўнікі ў беларускай мове маюць канчаткі *–ах(-ях),* а ў рускай мове - *ам(-ям)* ( *по дорогам – па дарогах, по выходным – па выхадных*).

Вялікая колькасць памылак звязана з ужываннем канчаткаў назоўнікаў. Напрыклад, у беларускай мове зборныя і рэчыўныя назоўнікі, а таксама назоўнікі, якія абазначаюць абстрактныя паняцці, дзеянні, тэорыі, з’явы прыроды маюць канчаткі *–у(-ю*). У рускай мове тыя ж самыя назоўнікі маюць канчаткі *–а(-я) (песка – пяску, мороза – марозу, мёда - мёду, юбилея - юбілею)*.

### 4. Марфалагічны разбор назоўнікаў

1. Слова ў тэкце.
2. Часціна мовы.
3. Пачатковая форма.
4. Лексіка-граматычны разрад (уласны ці агульны, канкрэтны ці абстрактны, зборны, рэчыўны; адушаўлёны ці неадушаўлёны, асабовы ці неасабовы).
6. Марфалагічныя прыметы: род, лік, склон.
7. Сінтаксічная роля ў сказе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІІ. Пытанні да самакантролю ведаў

1. Пры дапамозе якіх суфіксаў утвараюцца назоўнікі са значэннем асобы?
2. Ахарактарызуйце суфіксы, што утвараюць назоўнікі з абстрактным значэннем.
3. Якія марфемы выкарыстоўваюцца пры ўтварэнне зборных і рэчыўных назоўнікаў?
4. Ахарактарызуйце суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі назоўнікаў. Якія значэнні ім уласцівы?
5. Перылічыце спосабы ўтварэння назоўнікаў.
6. Ахарактарызуйце прыставачны спосаб утварэння назоўнікаў.
7. Што такое бязафікснае ўтварэнне?
8. Ахарактарызуйце асноваскладанне.
9. Што такое абрэвіяцыя і субстантывацыя? Прывядзіце прыклады.
10. Які спосаб словаўтварэння называецца семантычным?
11. Раскажыце пра правапіс некаторых суфіксаў назоўнікаў.
12. Якія складаныя назоўнікі пішуцца разам?
13. У якіх выпадках назоўнікі пішуцца праз злучок?
14. Ахарактарызуйце тыповыя памылкі ў выкарыстанні формаў назоўніка.
15. У якой паслядоўнасці трэба рабіць марфалагічны разбор назоўнікаў?

## ІІІ. Практычнаыя заданні

**Заданне 1. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам.**

1) арганіст;
2) выява;
3) падрахунак;
4) назіральнасць;
5) радца.

**Заданне 2. Адзначце правільны адказ.**

Абрэвіятуры могуць утварацца:

1) з пачатковых літар слоў;

2) з пачатку першага слова і канца другога;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) з поўных слоў;

4) з усечаных слоў;

5) з пачатковых гукаў слоў.

**Заданне 3. Адзначце словы, утвораныя прэфіксальным спосабам**.

1) садаклад;
2) звышідэя;
3) прыхаджане;
4) паўметра;
5) выселкі.

**Заданне 4. Адзначце правільнае выказванне**.

Пры ў тварэнні назоўнікаў спосабам складання выдзяляюцца такія тыпы, як:

1) складанне слоў;

2) складанне асноў;

3) складана-суфіксальны;

4) бязафіксны;

5) складана-прыставачны.

**Заданне 5. Адзначце правільную дэфініцыю тэрміна *субстантывацыя***.

1) пераход іншых часцін мовы ў назоўнікі;

2) пераход іншых часцін мовы ў прыметнікі;

3) пераход іншых часцін мовы ў займеннікі;

4) разнавіднасць марфалагчінага спосабу словаўтварэння;

5) разнавіднасць лексіка-семантычнага спосабу словаўтварэння.

**Заданне 6. Замяніце словазлучэнні аднаслоўнымі адпаведнікамі-назоўні камі.**

Вучань трэцяга класа - …; вучань чацвёртага класа - …, страфа з трох радкоў - …, тэрмін у дваццаць год - …, прызначаны для дваіх - …, дыстанцыя ў сто метраў - … .

**Заданне 7. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце суфіксы назоўнікаў, растлумачце іх напісанне.**

Кніж..чка, нож..чык, матылёч..к, званоч..к, Валодз..чка, Наташ..чка, ветр..к, арэш..к, баязлів..ц, аўстралі..ц, Сон..чка, хлоп..ц, Віц..чка, каласоч..к, мыльн..чка, камян..ца, роўн..дзь, віш..нька, вяноч..к, сшытач..к, застрэш..к, шчаслів..ц, Гал..чка, агародч..к, абцас..к, гармон..к, душ..чка, кош..к, гузіч..к.

**Заданне 8. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце суфіксы назоўнікаў, растлумачце іх напісанне.**

Аб’езд..ык, пераклад..ык, паднос..ык, бетон..ык, груз..ык, картатэт..ык, верталёт..ык, вугаль..ык, перапіс..ык, ракет..ык, бакен..ык, замаз..ык, выбар..ык, перадат..ык, закрой..ык, электразвар..ык.

**Заданне 9. Выпішыце ў адзін слупок складаныя назоўнікі, якія пішуцца разам, у другі – праз злучок. Растлумачце правапіс гэтых назоўнікаў.**

(Авія)матор, (вода)лячэбніца, (акцёр)аматар, (літаратура)знаўца, (арт)снарад, (жыцце)апісанне, (электра)зварка, (узаема)павага, (журналіст)міжнароднік, (мед)персанал, (контр)адмірал, (контр)удар, (сама)павага, (шасці)бор’е, (нацыянал)ліберал, (паў)боцікі, (нова)ўвядзенне, (піяніст)лаўрэат, (развед)група, (васьмі)томнік, (школа)студыя, (рай)цэнтр, (васьмідзесяці)годдзе, (разна)квецце, (кам)бат, (лён)даўгунец, (фота)рэпартаж, (нож)складанчык, (паў)Мінска, (паў)Украіны, (узаема)ветлівасць.

**Заданне 10. Спішыце сказ. Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых назоўнікаў.**

У аснове нашай вечна юнай ***любові*** да Радзімы, незалежна ад таго, пішам яе з вялікай ці з малой, ляжаць многія фактары. І сярод іх, несумненна, найважнейшае месца займае наша прыхільнасць да засвоеных ад самага дзяцінства слоў, якімі называюцца нашы ***вёскі*** і гарады, вуліцы і плошчы, паркі і скверы і паблізу ад месца жыхарства рэкі і азёры, палі і лугі…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У ***спадчыну*** ад мінулых пакаленняў нам дасталася велізарная колькасць назваў населеных пунктаў, рэк і ***азёр***, урочышчаў і іншых геаграфічных аб’ектаў. На зямлі нашай Бацькаўшчыны, бадай, не знойдзеш аніводнай народнай назвы, якая б узнікла выпадкова, без дай прычыны. Калі ўважліва прыгледзецца, дык заўсёды вызначыш, што вынікае яна з нейкіх асаблівасцей прыроднага асяроддзя, умоў вытворчай дзейнасці ***жыхароў*** і вельмі часта звязана з гістарычным мінулым ***чалавека***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ